**Кастусь ЦВІРКА**

# СЛЕД НА ЦАЛІКУ

## Творчы шлях Яна Чачота

Ян Чачот быў адным з самых актыўных членаў Таварыства філаматаў, агульнапрызнаным яго «дударом». Ён цалкам падзяляў філамацкія ідэі чалавекалюбства, развіваў іх разам з сябрамі, намагаўся іх ажыццяўляць, што праявілася ў яго імкненні паглыбіцца ў вусную паэзію роднага народа і асабліва ў спробе стварыць літаратуру на беларускай мове. Якраз за гэта больш за ўсё цанілі яго сябры-філаматы, вылучаючы на кіраўнічыя пасады.

Нарадзіўся Ян Чачот у вёсцы Малюшычы Наваградскага павета на самым схіле XVIII ст.— 24 чэрвеня 1796 г., якраз на свята Яна Купалы,— таму і атрымаў гэткае імя. Хрысцілі малога Яна «сына радавітай шляхецкай сям'і Чачотаў — Тадэвуша і Клавы з дому Гацінскіх», як даводзяць «Метрыкі», у парафіяльным касцёле ў Варончы. Прычым, ён быў ахрышчаны двойчы – спачатку, 6 ліпеня, уніяцкім, а потым, 19 ліпеня,— каталіцкім святаром, які даў яму і другое імя — Антоні.

З Малюшычаў, дзе арандавалі фальварак, Чачоты праз нейкі час перабраліся пад Баранавічы. Там гаспадар сям'і Тадэвуш Чачот наняўся да пана Тызенгаўза служыць аканомам у маёнтку Рэпіхава Навамышскай парафіі таго ж Наваградскага павета (цяпер Ляхавіцкі раён). Тут, на берагах ракі Мышанкі, прытоку Шчары, і *«прамільгнуў ранак жыцця»* Яна, як сведчыць яго балада «М ы ш а н к а».



Наваградак. Кляштар дамініканаў і павятовая школа, дзе навучаўся Ян Чачот.

Адсюль, з баранавіцкіх ваколіцаў, з-пад Новай Мышы, недзе ў 1809 г. юны Чачот, «Ян з Мышы», як потым назавуць яго сябры, падаўся на вучобу ў павятовы горад Наваградак у дамініканскую школу. Там (ад першага класа і на ўсё жыццё) пасябраваў ён са сваім аднакласнікам, будучым вялікім паэтам Адамам Міцкевічам. Хлапчукі разам гулялі на школьным падворку, на Замкавай гары, падарожнічалі па ваколіцах Наваградка, любілі слухаць расказы сустрэчных сялянаў, шляхцічаў, знаёміліся з іх жыццём і побытам. Аповеды бывалых людзей, сярод якіх быў і бацька Адама, Мікалай Міцкевіч, былы ўдзельнік паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, бунтавалі розумы і сэрцы дапытлівых юнакоў, гэтакіх непадобных на іншых «шкаляроў»,

прымушалі задумвацца над доляй свайго краю, над вытокамі сацыяльнай несправядлівасці. Ужо тады са спагадай і з павагай глядзелі сябры на просты люд, з якім сустракаліся на кожным кроку — і ў самім Навагрудку, і ў наваколлі. Ці не гэтая спагада, гэтая павага да людзей розных станаў і цягнула хлопцаў вывучаць іх вусную паэзію, абрады? Пра зацікаўленасць Яна Чачота і Адама Міцкевіча беларускім фальклорам у часы навучання ў Навагрудку сведчыць іх зямляк-навагрудчанін і сябар-філамат, славуты вучоны Ігнат Дамейка ў сваіх успамінах пра філамацкія гады.

У 1815 г., развітаўшыся часова з Навагрудкам, Ян Чачот і Адам Міцкевіч скіраваліся ў Вільню — шукаць сваё месца ў жыцці. Не здолеўшы трапіць у лік «казённакоштных» студэнтаў Віленскага універсітэта, як гэта ўдалося Адаму Міцкевічу, Ян Чачот мусіў шукаць нейкую працу. Спачатку меў невялікі заробак за паслугі віленскім адвакатам, а потым знайшоў пасаду пісара, альбо *«пішчыка»*, як ён сам сябе называў, у Пракураторыі радзівілаўскай, створанай Аляксандрам I спецыяльнай камісіі па разборы архіваў нясвіжскіх Радзівіла — пасля смерці апошняга іх прамога нашчадка Дамініка Радзівіла.

Толькі праз год пасля пераезду ў Вільню Ян Чачот змог ажыццявіць сваю мару стаць студэнтам «галоўнай школы Літвы» — Віленскага ўніверсітэта. Паступіў ён на факультэт маральных і палітычных навуік з мэтай вывучыцца на адваката. Таму заўсёды хадзіў «пад руку» са «Статутам Вялікага княства Літоўскага». *«Так я заглыблены ў «Статут»,* — пісаў Чачот сябру Ануфрыю Петрашкевічу, — *што калі з Жэготам пачынаем спяваць, то ён з кнігі нямецкай, а я са «Статута» што-небудзь спяваю»*[1]. Праўда, вўчобу трэба было спалучаць са службай ў Пракураторыі.


Навагрудак. Руіны замка Міндоўга і фарны касцёл.

Нягледзячы на вялікую занятасць, Ян Чачот знаходзіў час і для грамадскай працы. Даведаўшыся пра ўзнікненне Таварыства філаматаў, ён, не задумваючыся, уступае ў гэтую патрыятычную арганізацыю. Разам з Тамашом Занам, Адамам Міцкевічам, Юзафам Яжоўскім, Ануфрыем Петрашкевічам, Францішкам Малеўскім і іншымі ён аддаваў арганізацыі ўвесь свой малады імпэт. Чачот надзвычай актыўна выступаў на філамацкіх пасяджэннях са сваімі творамі, з разглядам творчасці сяброў, з навуковымі паведамленнямі, рабіў агляды варшаўскага друку. Аб грунтоўнасці і сур'ёзнасці яго выступленняў сведчыць прачытаная на адным з такіх пасяджэнняў рэцэнзія на баладу Адама Міцкевіча «Курганок

Марылі», якая захавалася да нашага часу. Але больш за ўсё любілі філаматы Яна Чачота за яго вясёлыя і смелыя песні і вершы, якія ён пісаў да ўсіх сходак і вечарынак філамацкай сям'і. Ян Чачот быў як бы штатным «песняром», «дударом» згуртавання. Прычым, ж падкрэслівае «Польскі слоўнік біяграфічны», «спецыяльнасцю яго былі беларускія песні, якія ён складаў на падзеі дня па ўзору народных песень»[2].

Калі было ўтворана Таварыства філарэтаў, Яна Чачота выбралі кіраўніком найболып важнага аддзела (саюза) — літаратурнага. Ен вельмі актыўна ўзяўся за згуртаванне мясцовых творчых сілаў, за выхаванне літаратурнай моладзі, з вялікай патрабавальнасцю ставячыся да творчасці пачаткоўцаў, за што маладыя літаратары празвалі яго «ментарам».

Пасля разгрому віленскіх студэнцкіх згуртаванняў Ян Чачот разам з Тамашом Занам і Адамам Сузіным (які быў родам з Пружаншчыны) трапіў на далёкі Урал. Спачатку адбываў пакаранне ў крэпасці Кізіл, (дарэчы, сюды царскія ўлады ссылалі паўстанцаў-касцюшкаўцаў), адкуль яго неўзабаве перавялі ў Уфу, а потым — у Цвер. У 1833 г. яму дазволілі вярнуцца — пад наглядам паліцыі — на Беларусь, у мястэчка Лепель, дзе ён уладкаваўся на службу ў дырэкцыі Бярэзінскага канала. І толькі ў 1839 г. «государь император высочайше повелеть соизволил» адпусціць Яна Чачота дамоў, на Наваградчыну, і зняць з яго паліцэйскі нагляд. Знямоглага за гады зняволення Яна Чачота ўзяў на пасаду бібліятэкара былы шчыры апякун філаматаў ліберальны граф Адам Храптовіч, які валодаў у Шчорсах адной з багацейшых у Еўропе бібліятэкай. Пасля смерці гаспадара Шчорсаў Ян Чачот жыў у сваіх сяброў на Наваградчыне — у вёсках Бортнікі, Вольная і Далматаўшчына, займаўся выданнем у Вільні сабраных ім твораў беларускага фальклору.



Адам Міцкевіч.
Мініяцюра належала Марылі Верашчацы.



Марыля Верашчака. Мініяцюра належала Адаму Міцкевічу.

Пасля цяжкая хвароба прывяла яго ў Друскенікі, «на воды». Але, на жаль, лекаванне не дало чаканага выніку, і 23 жніўня 1847 г. Ян Чачот, пражыўшы крыху болей за 50 гадоў, памёр у суседняй з Друскенікамі вёсцы Ротніца, дзе і быў пахаваны паблізу касцёла. Адам Міцкевіч, са спазненнем даведаўшыся пра смерць дарагога сябра, з болем у сэрцы пісаў 26 чэрвеня 1853 г. Ігнату Дамейку з Парыжа ў Чылі: «Дарагі Ігнат, вось што-кольвек пра нашых былых сяброў і мінулыя часы. З двух канцоў зямлі, якія аддзялілі нас адзін ад аднаго, мы бачым па-рознаму цяперашнія часы, у мінулым жа мы сустракаемся па-ранейшаму. Не ведаю, ці вядома табе, што ад нас пайшоў твой ранейшы таварыш, а мой стары друг (ад першага класа) Ян Чачот. Дзень яго смерці нам невядомы. Мы даведаліся толькі, што ён памёр, мне ўсё снілася пра яго адно і тое ж: што ён прыехаў у Парыж, а я з-за нейкіх перашкод не магу з ім пабачыцца. Гэта мучыла мяне ў сне, і я прачнуўся журботны. Мне доўга не хацелася верыць звесткам пра яго смерць, якія ў нас так цяжка праверыць. Цяпер я ведаю пэўна, што ён памёр. Доўгія гады і многа ўспамінаў звязвалі мяне з ім. Перад смерцю ён выдаў беларускія песні, і яны там выклікалі вялікую прыхільнасць...»[3].

Першыя вядомыя літаратурныя творы Яна Чачота з’явіліся недзе каля 1818 г. і, так ці інакш, былі звязаны з Таварыствам філаматаў.

Песні і вершы з нагоды студэнцкіх урачыстасцяў пісалі разам з Янам Чачотам і Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ануфры Петрашкевіч, Тэадор Лазінскі. «Аднак,— заўважае вядомы польскі фалькларыст і літаратуразнаўца Станіслаў Свірка ў кнізе «З кола філамацкага перадрамантызму»,— наймацней адбівалася ў жыцці філаматаў песенная творчасць якраз Чачота. Не было імянінаў, маёўкі ці сяброўскага сходу, якога б Янак (альбо Ян з Мышы — як яго таксама звалі) не аздобіў сваімі сардэчнымі «песенькамі», як

заўсёды, патрыятычнымі, народнымі па сваім духу, нярэдка напісанымі на матыў песні беларускага люду...»[4].

Тыя песні і вершы Яна Чачота, і польскія, і беларускія, якія дайшлі да нас дзякуючы публікацыі Яна Чубака («Паэзія філаматаў», т. 1—2, Кракаў, 1922) і іншых польскіх даследчыкаў, паказваюць нам цудоўны песенны талент паэта. Напеўнасць, «крылатасць», паводле выказвання Міцкевіча, непасрэднасць і празрыстасць верша дазвалялі Чачотавым песням вельмі



Ігнат Дамейка



Ануфры Петрашкевіч

лёгка класціся на музыку. Зрэшты, Ян Чачот часта і пісаў іх на гатовы ўжо матыў вядомых яму беларускіх народных песень. Пры гэтым ён не забываў пазначыць, на матыў якой канкрэтна народнай песні трэба было спяваць напісаныя ім строфы.

Вельмі любілі філаматы, ды і наогул віленская моладзь, напрыклад, вясёлую жыццярадасную песню Яна Чачота «Што старыя за вар'яты», напісаную дзесьці ў 1818 ці 1819 г. на матыў беларускай народнай песні «Чаму дзеўку не любіць, калі дзеўка ладна», што адзначыў у прыпісцы сам аўтар.

Такой жа бадзёрай, аптымістычнай была вельмі папулярная таксама сярод моладзі песня Яна Чачота «Прэч, прэч, сум, нудоты...» У прыпісцы да яе аўтар даводзіў, што напісана яна на матыў песні *«крывічанаў»*, г. зн. беларусаў, песні, якая пачыналася словамі: «Сем дзён малаціла, чах, чах — зарабіла...» Ахвотна спявала моладзь і творы Яна Чачота, што былі ім створаны на матывы беларускіх народных песень, якія пачыналіся словамі (іх зноў жа аўтар прыводзіць — каб ведалі, як спяваць): «Ой валы ж мае да палавыя», «Бяду сабе купіла да за свае грошы», «Як не бачу Петруся, то я з ветру валюся» і інш. Шмат такіх песень было напісана Янам Чачотам у турэмных засценках. Усе яны прызначаліся для паэтавай каханай Зосі Малеўскай — вельмі прывабнай дачкі рэктара Віленскага універсітэта (яе кахаў і Тамаш Зан). У кватэры рэктара часта збіраліся

філаматы, бо ягоны сын Францішак Малеўскі таксама быў сябрам таварыства. Гэтыя песні Зося выконвала пад фартэпіяна.

У многіх песнях Яна Чачота адбіліся антыўрадавыя настроі моладзі, вальналюбныя ідэі аўтара. Гэтыя творы віленская моладзь заўсёды сустракала бурнымі воплескамі ў час выступлення апошняга на сходках, а самога аўтара падымала «на ўра».

Але самы вялікі поспех ва універсітэцкай моладзі, абсалютная большасць якой паходзіла з апалячанай беларускай шляхты, мелі тыя філамацкія творы Яна Чачота, што былі напісаны па-беларуску. Сам факт звароту да мовы запрыгоненага, бяспраўнага мужыка-беларуса гаварыў пра многае, і перш за ўсё пра адкрыты дэмакратызм паэта.

Першыя з беларускіх твораў Яна Чачота, што дайшлі да нас,— гэта вершы, напісаныя да ўгодкаў старшыні Таварыства філаматаў Юзафа Яжоўскага, родам украінца.

Ян Чачот, які заўсёды выступаў са сваімі вершамі на падобных урачыстасцях, тым разам прыехаць на свята не здолеў. Як радзівілаўскі службовец ён у гэты час быў накіраваны ў Менск. Адтуль паэт і прыслаў свае вершы сябрам у Вільню, выказаўшы пры гэтым — зноў-такі ў лёгкай вершаванай форме — шкадаванне, што ў той час, калі яго прыяцелі *«апаражняюць бутэлькі»* ў вясёлым застоллі, ён *«посціць, як святы»,* у Менску, дзе яго прымушае *«маршчыніць чало мазольная пасада пісара»*[5]. Прысланыя вершы Яна Чачота зачытвалі на ўрачыстасці Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, а творы, што прызначаліся для спеваў, выконваліся жаночым і мужчынскім хорамі.

Беларуская мова песень і вершаў Яна Чачота будзіла ў слухачоў самыя лепшыя пачуцці, прымушала іх па-новаму глянуць на свой паняволены беларускі народ.

Папулярная сярод моладзі была і песня «Да пакіньце горла драць». Напісаў яе паэт да ўгодкаў сябра-філамата Дзіянісія Хлявінскага, які потым быў ксяндзом і служыў у Навагрудскім павеце. Выконвалася яна — з адпаведнымі папраўкамі — і на імянінах іншых філаматаў. Да нас песня дайшла (праўда, не цалкам) у варыянце, што спяваўся на дні нараджэння Францішка Малеўскага, якога сябры звалі Ярошам. Пачыналася песня так:

*Да пакіньце горла драць,*
*Да пакіньце, братцы, спяваць!*
*Да клікнейма адно раз:*
*Будзь здароў наш Ярош і*
*Благаславі яго Спас!..*

Тут у рукапісе быў пропуск. Пасля ішлі радкі:

*Да дай красну дзевачку,*
*Каб ён з сэрца пакахаў,*
*Ды з гарэлкай пляшачку —*
*Сват да яго к ней ехаў.*
*Гайда, гайда, гайда, гайда!..*[6]

У канцы абыгрывалася беларуская народная іншасказальная формула, якую звычайна прамаўлялі сваты на вяселлі.

Пра той вялікі поспех, які выпаў на долю гэтай вясёлай жыццярадаснай песні, расказвае ў лісце да Адама Міцкевіча 16 лістапада 1819 г. сам аўтар: *«На імяніны Дзіянісія я напісаў некалькі мужыцкіх песень* (заўважце — некалькі — **К. Ц.**), *сярод якіх апошняя «Да пакіньце горла драць» найбольш прыйшлася даспадобы Тамашу, ён прыдумаў да яе мелодыю, як ты ведаеш, і лез з ёй да ўсіх, як цыган на кірмашы. А раз спадабалася песня, я мусіў напісаць вершы і для Яроша і той самы верш «Да пакіньце горла драць» перарабіць для яго. І не толькі гэта, але і «Што мы вашэці скажам», разахвочаныя, спявалі. Словам, на імянінах і чыталі, і спявалі...»*[7].

Адаму Міцкевічу не проста спадабаліся беларускія песні Яна Чачота — і тыя, што ён сам чуў на імянінах у Юзафа Яжоўскага, і гэтая, апошняя, «Да пакіньце горла драць», пра якую раней ведаў з лістоў філаматаў. У гэтых песнях ён бачыў нешта больш значнае, больш важнае, чым звычайныя творы. Гэта ж нараджалася новая беларуская літаратура, літаратура на мове ўсім ім роднага народа. Сваё захапленне песнямі Яна Чачота ён выказаў у лісце да яго ад 27 лістапада таго ж года: «Што мяне... узрадавала – прызнаюся табе па-філамацку — гэта твая песня, дакладней, твае песні, я бачу ў іх агромністы і хуткі прагрэс з часу твайго ўступлення на пісьменніцкую дарогу. Лёгкасць, ды прытым агонь, сапраўды піндараўскі, пераўзышлі нават тыя надзеі, якія я ўскладаў на цябе. Прэч з дарогі, Заны, прэч, Адамы! Не лянуйся, калі ласка! пішаш усё лёпш...»[8].

Беларускія песні Яна Чачота ведалі і сцявалі ўсе філаматы. Ведаў і спяваў іх з сябрамі і Адам Міцкевіч. Нагадаем адзін маленькі факт, пададзены, ў лісце Тамаша Зана да Верашчакаў ад 31 кастрычніка 1820 г. Едучы неяк у Вільню, Тамаш Зан заначаваў у заезным доме ў Канвалішках. Раптам сярод ночы яго будзіць гучны і вясёлы спеў: «Да пакіньце горла драць...». Калі ён прахапіўся, то ўбачыў перад сабой двух сяброў — Адама Міцкевіча і Яна Чачота. Яны ехалі з Вільні і таксама спыніліся на гэтай станцыі. Даведаўшыся, што тут начуе іх сябар Тамаш Зан, яны гэтакім чынам выказалі радасць ад сустрэчы.

Ведаючы, якую ўвагу надае Адам Міцкевіч творам на беларускай мове, Ян Чачот у гонар аднаго з прыездаў апошняга з Коўна піша па-беларуску прывітальны верш: «Едзеш, міленькі Адам...»

Калі разам з іншымі філаматамі і філарэтамі Ян Чачот трапляе ў вязніцу (спачатку ў касцёле святога Казіміра, а потым у кляштары францішканцаў), ён і там складае творы на беларускай мове. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, Чачот пасля абвяшчэння яму судовага выраку спяваў складзеную ім развітальную песню, дзе былі такія радкі:

*Да лятуць, лятуць да дзікія гусі,*
*Да нас павязуць да далёкай Русі...*[9]

Адам Мальдзіс у кнізе «Падарожжа ў XIX стагоддзе» (1969) аргументавана даводзіць, што ў Яна Чачота былі і іншыя беларускія творы, сярод іх п’еса, прысвечаная Адаму Міцкевічу, напісаная для тэатра. На жаль, гэтая п’еса, як і шмат іншых твораў паэта, да нас не дайшла.

На маю думку, беларускім песням і вершам Яна Чачота філамацкага перыяду на сённяшні дзень не дадзена належная ацэнка нашым літаратуразнаўствам. Вядома, калі мераць сённяшнімі меркамі, у іх шмат можна знайсці недахопаў. Але ж не трэба забываць, што Ян Чачот быў першапраходцам у беларускай паэзіі. Ен ішоў па цаліку, яму трэба было яшчэ ўздымаць, кажучы Купалавымі словамі, «сваю скібіну слова».

Тым не менш, у беларускіх творах Яна Чачота і сапраўды ёсць тая «лёгкасць», той паэтычны «агонь», пра якія казаў у свой час Адам Міцкевіч. Мова твораў Чачота, калі нё зважаць на нешматлікія паланізмы, мала чым адрозніваецца ад сённяшняй беларускай мовы. Яна ў яго даволі багатая, гнуткая, з многімі адценнямі. Узорам для Яна Чачота служыла мова беларускіх народных песень.

Ян Чачот і пасля вяртання з ссылкі пісаў вершы і песні на беларускай мове — ён нават змясціў іх у сваіх фальклорных зборніках 1844 і 1846 гг. У гэтых творах паэт таксама праявіў павагу да роднага народа, выказаў спачуванне да яго нядолі (напрыклад, вершы «Да мілых мужычкоў», «Нашто нам дым выядае вочкі», «Покуль сонца ўзыдзе» і інш.).

Але найчасцей Ян Чачот імкнуўся прымірыць селяніна з панам. *«Дабрачынных»* паноў ён заклікаў (больш у польскамоўных творах) клапаціцца *«пра добры быт сялян»,* любіць іх.

У беларускіх вершах паэт вучыў селяніна маральна ўдасканальвацца, не тапіць сваё жыццё у гарэлцы, быць шчырым і клапатлівым гаспадаром.

Грамадзянскі пафас беларускіх вершаў Яна Чачота вельмі выразны. І ніяк нельга пагадзіцца са сцвярджэннем Алега Лойкі, быццам «для Чачота беларускія вершы былі практыкаваннямі на беларускай мове» і што «творы на беларускай мове ён выдаваў для нашчадкаў, асабліва для навукоўцаў-лінгвістаў, стараючыся захаваць для іх непаўторныя ўзоры»[10]. Так, Яна Чачота і «аматары славяншчыны» падахвочвалі пісаць па-беларуску. Але ж галоўным матывам было зусім не гэта. Паэт думаў не пра навукоўцаў-нашчадкаў, а пра сучаснага яму селяніна, шчыра жадаючы палепшыць яго долю. Вось якое жаданне выказвае сам аўтар у прадмове да «Сялянскіх песень з-над Нёмана і Дзвіны» (1844): *«Ці не перанесліся б яны як-небудзь да вёсак? Ці не дайшлі б да сэрцаў дабрачынных паноў і ці не звярнулі б больш чулую ўвагу на сялян, а разам з тым ці не прычыніліся б да палепшання нораваў гэтых працавітых суайчыннікаў?»*[11]

З літаратурнай спадчыны Яна Чачота вялікую цікавасць маюць таксама напісаныя ім у 1818—1819 гг. на польскай мове балады, што адыгралі надзвычай важную ролю ў творчай біяграфіі яго славутага сябра Адама Міцкевіча.

Да нас дайшло восем баладаў Яна Чачота, што напісаны аўтарам паводле вуснай паэзіі беларускага народа.

Польскія даследчыкі, відавочна, не ацанілі яшчэ як след мастацкіх вартасцяў баладаў Яна Чачота. Галоўныя іх недахопы яны бачаць у рыхласці кампазіцыі, зацягнутасці, а таксама ў тым, што аўтар слепа трымаўся фальклорнай асновы, а галоўнае — карыстаўся гутарковай мовай, «засмечанай» шматлікімі «правінцыялізмамі», «дыялектызмамі», інакш кажучы, беларускімі словамі і выразамі.

Затое фалькларысты надаюць баладам Яна Чачота надзвычай важнае значэнне, бо яны данеслі да нас вельмі многа каштоўных звестак з фальклору, амаль цалкам беларускага. Ва ўсіх васьмі баладах Янам Чачотам было «зафіксавана», як падлічыў Станіслаў Свірка, дванаццаць паданняў і народных казак, а таксама дзесяць матываў з народных вераванняў і звычаяў. Прычым, як народныя паданні і казкі, так і гэтыя матывы пададзены аўтарам з вялікай дакладнасцю.[12]

Упершыню пра балады Яна Чачота расказаў у польскім друку ў 1886—1889 гг., гэта значыць праз шэсцьдзесят гадоў пасля напісання, Ян Рыхтар, які натрапіў у паперах аднаго з сяброў паэта — гаспадара маёнтка Цешаўля Наваградскага павета Адольфа Кабылінскага — на рукапісны сшытак з Чачотавымі баладамі. Але хутка гэты сшытак на доўгі час выпаў з поля зроку даследчыкаў. Яго лічылі страчаным. Другі раз яго знайшоў у 1953 г.— зноў праз шэсцьдзесят з лішнім гадоў! — другі польскі даследчык Чэслаў

Згажэльскі: як выявілася, перададзены ў бібліятэку Асалінскіх у Львове, сшытак быў няправільна зарэгістраваны і патануў у папяровым моры, адкуль быў толькі выпадкова выцягнуты на святло. І толькі нядаўна яшчэ праз дваццаць пяць гадоў, а дакладней, у 1972 г.,— усе восем знойдзеных баладаў Яна Чачота былі апублікаваныя — упершыню! — Станіславам Свіркам у памянёнай кнізе «З кола філамацкага перадрамантызму». Інакш кажучы, больш за сто гадоў яны былі схаваныя ад чытацкіх вачэй.

Балады Яна Чачота надзвычай зацікавілі Адама Міцкевіча, які падчас іх напісання толькі шукаў сваю дарогу ў літаратуры. Як вядома, ў першых сваіх творах ён прытрымліваўся прынцыпаў класіцызму, якія станавіліся ўсё больш цеснымі для адлюстравання новых, больш радыкальных настрояў у передавых грамадскіх колах. Адзін з галоўных шляхоў абнаўлення літаратуры перадавыя яе прадстаўнікі бачылі ў звароце да народнага жыцця, да фальклору. Гэты шлях якраз і выбраў шчыры народалюбец Ян Чачот, які з поўным усведамленнем важнасці сваёй справы ўзяўся за мастацкае асваенне фальклорнай спадчыны беларускага народа.

Пра ролю Яна Чачота ў нараджэнні рамантызму ў польскай літаратуры цікава расказаў Станіслаў Свірка ў напісаных ім раздзелах кніг «Народнасць у Міцкевіча» (Варшава, 1958), «Гісторыя польскай фалькларыстыкі: 1800—1863» (Варшава, 1970) і ў памянёнай кнізе пра філамацкі перадрамантызм. Вядомы польскі вучоны прыйшоў да высновы, што «...тыя «песенькі» і «балады» Чачота былі галоўным імпульсам, які падштурхнуў Міцкевіча ў кірунку народнасці…»[13]

Адам Міцкевіч быў, вядома ж, вельмі ўдзячны свайму сябру. Недарэмна, прысвячаючы сваю першую, сапраўды праграмную кнігу «Балады і рамансы» сябрам-філаматам, першым сярод іх ён назваў імя Яна Чачота.

Не могуць не выклікаць цікавасці і польскамоўныя вершы Яна Чачота, у якіх ярка праявіўся дэмакратызм паэта. У 1846 г. яны выйшлі асобным зборнікам **«Песні вяскоўца»**. Біёграфы паэта не абыдуць увагай і яго *«трэны»,* дзе шмат звестак з жыцця самога аўтара, а таксама гістарычныя *«песні»,* у якіх ён хацеў намаляваць гісторыю Беларусі ад даўніх часоў.

Разам з тым Ян Чачот, як відаць з яго выказванняў, не лічыў літаратуру галоўным заняткам у сваім жыцці. Ён быў надзіва самакрытычны і ведаў цану свайму таленту, магчыма, нават змяншаў яго. Хоць Адам Міцкеэіч вельмі шчыра захапляўся яго творамі, пісаў яму, што не бачыць у сябе «вышэйшых талентаў», чым у яго, усё ж Ян Чачот не прыняў такой завышанай ацэнкі сваёй творчасці.

Сваё галоўнае прызванне бачыў Ян Чачот у іншым — у збіранні і вывучэнні беларускага фальклору, якому ён надаваў вялікае значэнне ў змаганні за народнасць літаратуры, за яе дэмакратызацыю.

У беларускай фалькларыстыцы Ян Чачот — постаць, можна сказаць, першай велічыні. Яго дзейнасць у гэтым ктрунку яшчэ чакае свайго шырокага асвятлення. Гэта быў сапраўды подзвіг паэта-фалькларыста, які здолей на працягу 1837-1846 гг. сабраць і выдаць у шасці зборніках беларускія народныя песні *«з-над Немана і Дзвіны»,* а таксама іншыя жанры фальклору. Прычым, калі спачатку ён даваў іх у перакладзе на прльскую мову, то потым публікаваў у арыгінале, на беларускай мове. Праз гэта ён паказаў свету, якія неацэнныя культурныя скарбы мае беларускі народ.

З глыбокай павагай ставіўся Я. Чачот да мовы беларускага народа, якую ён называў крывіцкай. Паэт марыў пра граматыку і фундаментальны слоўнік беларускай мовы, такі, як шматтомны «Слоўнік польскай мовы» С. Ліндэ, выдадзены у 1807—1814 гг. Я. Чачот са шкадаваннем адзначаў, што ў той час, як *«іншыя дыялекты славянскага паходжання»,* нават невялікія народы, усё гэта маюць даўно, *«крывіцкае племя, якое налічвае некалькі мільёнаў насельніцтва»*, наадварот, нічога яшчэ не займела. Не чакаючы, пакуль нехта займецца гэтай важнай і вялікай працай, паэт сам пачаў складаць слоўнік найбольш адметных слоў і выразаў Наваградчыны. У сваіх артыкулах ён зрабіў дэталёвы разгляд асаблівасцей беларускай мовы, выявіў нават яе дыялекты.

Жаданне бачыць мову свайго народа літаратурнай і прывяло Я.Чачота да ўласнай творчасці на беларускай мове, да выдання кніг на ёй. І вось яшчэ ў першай палове XIX ст.упершыню пасля векавога маўчання, са старонак друкаваных, выдадзеных па ўсіх правілах, кніг загучала жывая беларуская мова, мова запрыгоненага селяніна. Дзве кнігі Яна Чачота **«Сялянскія песні з-пад Нёмана і Дзвіны з далучэннем іх арыгіналаў на славяна-крывіцкай мове»** (1844) і **«Сялянскія песні з-пад Нёмана і Дзвіны, некаторыя прыказкі і ідыёмы на славяна-крывіцкай мове, з учыненымі над ёй назіраннямі»** (1846) — яскрава засведчылі факт нараджэння новай беларускай літаратуры і адначасова нацыянальнага адраджэння аднаго з самабытных і вялікіх народаў.

З твораў розных жанраў, з лістоў да сяброў, знаёмых, да дзеячаў культуры Беларусі паўстае перад намі вельмі прывабны вобраз нашага першага сапраўднага паэта, чалавека высокай культуры, які ведаў многія еўрапейскія мовы (французскую, нямецкую, ангельскую, лаціну, польскую, расейскую), які да канца сваіх дзён застаўся верны свайму беларускаму народу, яго культуры і мове.

Усе творы Яна Чачота — сапраўды беларускія. І не толькі тыя, што напісаны на беларускай мове, але і польскамоўныя. Беларускія і сваім пафасам, і тымі праблемамі, якія вырашае ў іх паэт, і выключным мясцовым матэрыялам, вельмі добра вядомым аўтару. Яны самі па сабе яскрава гавораць нам, што Ян Чачот — сапраўды беларускі нацыянальны паэт.

[1] **Чачот Я**. Наваградскі замак. – Мн., 1989. – С. 252.

[2] **Polski slownik biograficzny**. – W-wa, 1938, t.4. – С.316 – 317.

[3] **Мицкевич А.** Собрание сочинений в 5 томах. Т.5. – М., 1954. – С.587 – 588.

[4] **Swirko S.** Z kręgu filomackiego preromantyzmu. – W-wa, 1972. – С. 222.

[5] **Poezya filomatów**. Т. 2. – Krakow, 1922. – С. 68.

[6] **Тамсама**. – С. 187.

[7] **Чачот Я**. Наваградскі замак. – С. 242.

[8] **Мицкевич А.** Собрание сочинений в 5 томах. Т.5. – С. 298.

[9] **Цвірка К**. Лісце забытых алеяў. – Мн.,1993. – С. 54.

[10] **Лойка А**. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1. – Мн., 1977. – С. 10 – 11.

[11] **Чачот Я**. Наваградскі замак. – С. 177.

[12] **Swirko S**. Z kręgu filomackiego preromantyzmu. – С. 53.

[13] **Ludowośe u Mickiewicza**. – W-wa, 1958. – S. 115.